# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 1(47) 2006**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**

## Змест

***Галоўны рэдактар:***
**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
У. В. Амелькін
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

***Гісторыя***

*Пуцік У. С.* Адлюстраванне сацыяльных аспектаў у дзейнасці мясцовых камітэтаў Асобай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці Паўночна-Заходняга краю ........ 3

*Рыжанкоў І. М.* Беларускае сялянства ва ўмовах падрыхтоўкі да аграрнай рэформы (сакавік — лістапад 1917 г.) ........ 8

*Ганчар А. І.* Праблемы ўзаемаадносін каталікоў і праваслаўных на старонках газеты «Наша Ніва» (1906—1908 гг.) ........ 12

*Цымбал А. Г.* Праваслаўная Царква і нацыянальнае пытанне ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) ........ 16

*Доўнар Л. А.* Палітыка стымулявання кустарна-рамеснай вытворчасці Беларусі ў 20-х гг. XX ст. ........ 19

*Каспяровіч А. М.* Арганізацыя навучальнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах у 20-х гг. XX ст. ........ 23

*Груца І. А.* Бярэзінская версія лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона і каштоўнасцей Вялікай арміі ў ваеннай кампаніі 1812 г. ........ 27

*Якаўчук В. І.* Зараджэнне і развіццё ў Беларусі добраахвотных пажарных таварыстваў (другая палова XIX ст.) ........ 30

*Вінніца Г. Р.* Нацыянальная палітыка генацыду супраць яўрэйскага насельніцтва Мазыра ........ 33

*Малюгін А. І., Каваяка І. І.* Асаблівасці старажытнаегіпецкага пантэона ........ 36

*Цзян-Шу-і.* Расія і Тайвань: праблемы ўзаемаадносін ........ 40

*Пятроўская А. В.* Праблемы арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ Балгарыі і Польшчы (1944—1989 гг.) ........ 43

*Космач А. М.* Становішча Югаславіі ў палітыцы «разрадкі» паміж Усходам і Захадам у 70-х гг. XX ст. ........ 48

*Варывончык І. В.* Сярэдні клас і асаблівасці сучаснай сістэмы сацыяльнага забеспячэння ў ЗША ........ 57

***Філасофія***

*Навумаў Дз. І.* Палітыка-камунікацыйны аспект функцыяніравання палітычнай сістэмы постсавецкай Беларусі (паліталагічны аналіз) ........ 65

*Кузняцоў А. У.* Філасофія і рэвалюцыя (асноўныя этапы развіцця сацыяльнай думкі Новага часу) ........ 69

*Шапяцюк В. В.* Грамадзянскае грамадства і дзяржава: грані ўзаемадзеяння ........ 73

*Васько І. І.* Асэнсаванне канцэпцыі грамадзянскага грамадства ў сучаснай сацыяльнай думцы Рускай Праваслаўнай Царквы ........ 76

*Патоцкі А. А.* Камунікатыўная прырода традыцыі і яе роля ў працэсе разумення тэксту ........ 83

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ГІСТОРЫЯ

УДК 947.6:631.3

У. С. Пуцік

## АДЛЮСТРАВАННЕ САЦЫЯЛЬНЫХ АСПЕКТАЎ У ДЗЕЙНАСЦІ МЯСЦОВЫХ КАМІТЭТАЎ АСОБАЙ НАРАДЫ АБ ПАТРЭБАХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ

Канец XIX — пачатак XX ст. адзначаны ў Расіі абвастрэннем унутрыпалітычнага становішча, што стала вынікам глыбокага крызісу, які паразіў у гэты час аграрны сектар эканомікі і палітычную сістэму краіны. Аднак яго прычыны бачыліся і тлумачыліся як сведкамі тых падзей, так і гісторыкамі па-рознаму, нават з процілеглых пунктаў гледжання.

У савецкай гістарыяграфіі панаваў ленінскі падыход, згодна з якім «...сутнасць аграрнага пытання і аграрнага крызісу заключалася не ў тым, каб устараніць перашкоды падняццю агрыкультуры, а ў тым, якім чынам устараніць гэтыя перашкоды, якому класу і якімі метадамі правесці гэтае ўстараненне» [1, с. 125]. Такім адзіна правільным метадам, на думку У. І. Леніна, павінна была стаць «нацыяналізацыя зямлі... ператварэнне зямлі ва ўласнасць дзяржавы, і такое ператварэнне ніколькі не закранае прыватнай гаспадаркі на зямлі» [1, с. 127].

Такім чынам, У. І. Ленін, пагаджаючыся з тым, што земляробчы крызіс у Расіі ў канцы XIX ст. з'яўляўся вынікам крызісу агракультурнага сектара, вырашэнне яго выводзіў выключна ў плоскасць карэнных палітычных пераўтварэнняў у краіне. Адсюль галоўным і асноўным напрамкам вырашэння крызісу павінна была стаць ліквідацыя памешчыцкага землеўладання. Гэта пры тым, што дваранам у 1905 г. з 280 млн дзесяцін сапраўднага сельскагаспадарчага фонду Еўрапейскай Расіі належала толькі 53,2 млн дзесяцін [1, с. 60]. Таму, «калі б размеркаваць усю прыватную ворыўную зямлю сярод сялян, «прырэзка», якая склала 0,8 гектара, не ўнесла б істотных змяненняў» [2, с. 126]. Такога ж погляду прытрымліваліся шэраг вучоных-эканамістаў, а таксама і ўрадавыя колы Расіі.

Палітызацыя пытання аб аграрным крызісе ў разглядаемыя гады, ініцыятарам якой з'явілася сацыял-дэмакратычная партыя, стала прычынай таго, што савецкія гісторыкі мала звярталі ўвагі на высвятленне яго эканамічных прычын. У той жа час яны давалі адназначна негатыўныя ацэнкі праграмам і дзеянням урада па вывадзе сельскай гаспадаркі з крызісу . Таму іх вывучэнне на сучасным этапе мае не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне.

Адна з грунтоўных урадавых праграм такога кшталту — гэта стварэнне і дзейнасць Асобай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці на чале з міністрам фінансаў С. Ю. Вітэ. Палажэнне аб ёй было падпісана 23 студзеня 1902 г. царом Мікалаем II. Яе стварэнне стала вынікам прызнання ва ўрадавых колах таго факта, што няўдалая і недаведзеная да канца сялянская рэформа 1861 г. стала прычынай не толькі аграрнага крызісу, але і тармажэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў цэлым. Паспрыялі ўсведамленню вышэйадзначанага ўрадавымі коламі і частыя неўраджайныя гады ў канцы XIX ст., а з імі рост сялянскіх хваляванняў. Гэта сведчыла аб сур'ёзным намеры ўрада вырашыць, нарэшце, аграрнае пытанне ў адпаведнасці з сацыяльна-эканамічнымі патрабаваннямі, якія склаліся ў краіне на гэты час.

У склад Асобай нарады ўвайшло 20 саноўнікаў, у тым ліку міністр унутраных спраў Дз. С. Сіпягін, міністр земляробства А. С. Ярмолаў, члены Дзяржаўнага Савета, а таксама старшыня Маскоўскага таварыства сельскай гаспадаркі князь А. Г. Шчарбатаў [3, с. 163].

На месцах утвараліся губернскія і павятовыя камітэты (па краіне было створана каля 600). У іх склад уключаліся прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі, спецыялісты сельскай гаспадаркі, земскіх органаў, а ў асобых выпадках нават і настаўнікі. Зварот Асобай нарады да зацікаўленых слаёў насельніцтва аб тым, як яны самі разумеюць свае патрэбы, быў смелым і дальнабачным крокам.

У склад губернскіх камітэтаў Заходніх губерняў павінны былі ўваходзіць: губернатар — старшынствуючы, губернскія і павятовыя кіраўнікі дваранства, адзін абавязковы член

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

губернскай прысутнасці ці член ад урада губернскай па сялянскіх справах прысутнасці (па прызначэнні губернатара), кіруючы казённай палатай і дзяржаўнымі маёмасцямі, прадстаўнік удзельнай акругі, мясцовы прадстаўнік управы Земляробства і Дзяржаўных маёмасцей (дзе такі маецца), старшыні сельскагаспадарчых таварыстваў і ўсе тыя асобы, удзел якіх прызнае карысным для справы губернатар ці якія будуць указаны Асобай нарадай [4, л. 153].

30 мая выйшла распараджэнне Старшыні нарады, Міністра фінансаў С. Ю. Вітэ за № 271 аб адкрыцці павятовых камітэтаў. Склад павятовых камітэтаў для дзевяці Заходніх губерняў вызначаўся наступным чынам: кіраўніцтва ажыццяўляў павятовы кіраўнік дваранства, членамі маглі быць службовыя асобы, указаныя губернатарам, і прыватныя асобы, запрошаныя павятовым кіраўнікам дваранства [4, л. 153 адв ].

З мэтай дэталёвага ўдакладнення задач камітэтаў і для большай зручнасці пры абмеркаванні пытанняў Асобай нарадай быў выдадзены 9 жніўня 1902 г. новы цыркуляр. Выкарыстоўваючы яго, шматлікія камітэты мелі права не разглядаць усе пункты, акрэсленыя праграмай, калі па іх не мелася кампетэнтных асоб; дзеля большай зручнасці пры абмеркаванні запланаваных пытанняў даводзілася прапаноўваць іх размеркаванне сярод членаў камісіі ў залежнасці ад ступені ведання праблемы. Агульная колькасць членаў камітэтаў 49 губерняў Еўрапейскай Расіі перавысіла 11000 чалавек. На абмеркаванне было прапанавана 27 прыватных пытанняў [5, с. 6].

С. Ю. Вітэ, пры падвядзенні папярэдніх вынікаў дзейнасці губернскіх і павятовых камітэтаў, у «Запісцы па сялянскай справе» рэзюміраваў: «Хоць прыватная праграма, абвешчаная мясцовым камітэтам, цалкам не закранала сялянскага пытання, тым не менш камітэты, карыстаючыся дадзеным ім правам адказаць на агульнае пытанне аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці, увайшлі ў абмеркаванне сялянскай справы па сваім пачыне, прызнаўшы, што пасяховае развіццё сельскагаспадарчай прамысловасці ў бліжэйшым залежыць ад такога паляпшэння прававога стану нашага сялянства, якое садзейнічала б развіццю ў ім духу гаспадарчай прадпрымальнасці і самадзейнасці...» [5, с. 4]. Матэрыял, дасланы мясцовымі камітэтамі, быў апублікаваны ў пачатку 1904 г. у 54 тамах.

Пастановы сельскагаспадарчых камітэтаў у Паўночна-Заходніх губернях уяўляюць вялікую цікавасць, бо тут яшчэ не было сталых органаў, здольных гаварыць ад імя ўсяго насельніцтва аб яго карысці і патрэбах. Голас сельскагаспадарчых камітэтаў быў у такіх умовах першым адлюстраваннем грамадскай думкі — адлюстраваннем, безумоўна, недастатковым і няпоўным, але, тым не менш, якое заслугоўвага асаблівай увагі.

Склад камітэтаў быў вельмі разнародным. Правам запрашэння да ўдзелу ў камітэтах асоб, якія не з'яўляліся абавязковымі іх членамі, у адпаведнасці з Палажэннем, старшыні камітэтаў карысталіся ў рознай ступені. У працы губернскіх камітэтаў прымалі ўдзел выключна мясцовыя чыноўнікі і землеўладальнікі. Іх колькасць і суадносіны не мелі прынцыповага характару. Так, у пасяджэннях Мінскага Губернскага Камітэта прымалі ўдзел 83 асобы [6, с. 115]. Узначаліў працу Мінскі губернатар А. А. Мусін-Пушкін. У склад Камітэта губернатарамі былі запрошаны ўплывовыя памешчыкі губерні — Э. А. Вайніловіч, І. Э. Друцкі-Любецкі, Е. І. Любаньскі, І. А. Папа-Афанасапула.

Магілёўскі Губернскі Камітэт налічваў 32 члены, сярод якіх 18 былі прадстаўнікамі чыноўніцтва, 14 — землеўладальнікі. Да працы ў склад камітэта Магілёўскім губернатарам М. М. Клінгенбергам былі запрошаны знакамітыя навукоўцы і ўплывовыя памешчыкі губерні, сярод якіх: М. К. фон Гюбенет, С. А. Шыдлоўскі, А. Я. Хамянтоўскі [7, с. 6].

Віленскі губернатар генерал-лейтэнант фон Вайль запрасіў для ўдзелу ў працы камітэта толькі двух памешчыкаў — прадстаўнікоў Віленскага Таварыства сельскай гаспадаркі, і 11 губернскіх чыноўнікаў [8, с. 1].

Згодна з данымі журналаў пасяджэння Віцебскага Губернскага Камітэта, Віцебскі губернатар І. І. Чапялеўскі запрасіў прыняць удзел у працы камітэта 26 чыноўнікаў і 20 памешчыкаў, сярод якіх былі: С. І. Лапацінскі, П. Г. Дапельмайер, І. Ф. Полаўцаў, Б. Б. Шахно [9, с. 1].

Выконваючы абавязкі Гродзенскага губернатара, П. А. Сталыпін у члены камітэта запрасіў 12 губернскіх чыноўнікаў і 14 землегаспадароў [10, с. 1]. Сацыяльны склад губернскіх камітэтаў, як правіла, быў аднародным, у большасці выпадкаў гэта былі прадстаўнікі дваранства.

У павятовых камітэтах таксама дамінавалі мясцовыя чыноўнікі, аднак у іх у больш-менш значнай колькасці прысутнічалі прыватныя асобы. Сярод прыватных асоб, запрошаных да ўдзелу ў камітэтах, пераважалі землеўладальнікі, што займаліся менавіта сельскай гас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падаркай, але да іх далучаліся часам кіруючыя маёнткамі. Рэдка ўдзельнічалі ў камітэтах святары, купцы, прафесура, настаўнікі, урачы. Сяляне ўдзельнічалі ў працы 17 з 46 павятовых камітэтаў Паўночна-Заходняга краю [6, с. 153; 9, с. 90].

На першым пасяджэнні Віленскага губернскага камітэта губернатар выказаў меркаванне, што да запрашэння сялян трэба ставіцца вельмі асцярожна, бо яны могуць, не зразумеўшы мэт Асобай нарады, зрабіць цалкам нявызначаныя і непажаданыя высновы; больш мэтазгодна таму было б даведацца аб меркаванні сялян праз апытанні іх міравымі пасрэднікамі [8, с. 1]. Наадварот, Магілёўскі губернатар выказаў спачуванне на тое, што ў павятовых камітэтах (акрамя Быхаўскага) не далучаліся да ўдзелу сяляне ў якасці прадстаўнікоў шматмільённага сельскага насельніцтва, інтарэсы якога блізка звязаны з інтарэсамі іншых саслоўяў [4, л. 278; 6, с. 6].

Увогуле можна сказаць, што ў стварэнні камітэтаў галоўную ролю іграла выпадковасць, бо ўсё залежала ад пазіцыі старшыняў. Аднак працавалі камітэты Паўночна-Заходняга краю даволі аператыўна. Ужо ў пачатку 1903 г. пастановы і рэкамендацыі павятовых камітэтаў паступілі ў губернскія канцылярыі.

Іх пастановы мелі ў большасці ўзважаны і канкрэтны характар. Даволі часта ставілася на парадак дня і вырашалася станоўча пытанне аб раўнапраўі саслоўяў. З павятовых камітэтаў Гродзенскай губерні такога кшталту заявы ў вышэйазначаным напрамку былі зроблены Беластоцка-Сакольскім і Гродзенскім. Пастановы, прынятыя сходамі камітэтаў, канстатавалі, што ў інтарэсах узняцця культуры і маральнасці, безумоўна, неабходна даць сельскім абывацелям агульныя грамадзянскія правы; для вырашэння вызначаных пытанняў трэба рэарганізаваць валасны суд у міравы суд, вызваліць яго ад адміністрацыйнай апекі [10, с. 461—462]. У Себяжскім павятовым камітэце Віцебскай губерні селянін Дзямешка (валасны суддзя) выказаў пажаданне, каб «сялянскае саслоўе не было такім прыніжаным. Цяпер і на само земляробства, і на селяніна самы апошні гарадскі мешчанін глядзіць як на нешта самае нізкае» [9, с. 530].

У Магілёўскім губернскім камітэце за вызваленне сялян ад празмернай апекі падалі голас два члены (у тым ліку губернскі прадвадзіцель дваранства). Такі ж погляд быў выказаны Чавускім павятовым камітэтам у поўным яго складзе. У Пінскім павятовым камітэце Мінскай губерні адзін з членаў выказаў меркаванне, што дзеля поспеху пераўтварэнняў эканамічнага кшталту, якія тычацца сялянскага землеўладання, неабходна тоеснасць правоў сялянскага насельніцтва з правамі іншых саслоўяў [6, с. 367]. У Віленскай губерні на баку прадстаўнікоў гэтага кірунку аказаўся савет Віленскага сельскагаспадарчага таварыства. У запісцы, пададзенай Віленскаму губернскаму камітэту, абумоўлівалася, што «карысна было б падначаліць сялян агульнаму з астатнім насельніцтвам правапарадку і даць... магчымасць кіравацца ва ўсіх сваіх жыццёвых патрэбах цвёрдымі асновамі закона, адзінага і роўнага для ўсіх» [8, с. 47].

Існаванне саслоўнага валаснога суда было адной з форм адасобленасці сялянства. Супраць раздаваліся галасы нават у камітэтах, якія не ставілі агульнага пытання аб роўнасці саслоўяў. У Віленскай губерні, напрыклад, Лідскі павятовы камітэт вырашыў, што існуючы валасны суд не толькі не дапамагае матэрыяльнаму і маральнаму дабрабыту селяніна, але часта падрывае яго і дэмаралізуе. За карэнную рэформу валаснога суда падаў голас у Мінскім павятовым камітэце адзін з мясцовых земскіх начальнікаў (не згодны таксама з цялеснымі пакараннямі), у Пінскім (Мінскай губ.), Быхаўскім (Магілёўскай губ.) — мясцовыя землеўладальнікі. Да такой жа высновы прыйшлі Віцебскі губернскі і Гомельскі павятовы камітэты [8, с. 93; 6, с. 73].

За ўвядзенне земскіх устаноў у поўным іх аб'ёме выказаліся (часам грунтуючыся на палажэнні 1864 г.) члены многіх камітэтаў, але іх меркаванні ў рэдкіх выпадках падтрымлівала большасць камітэтаў. Так, у Гродзенскай губерні пытанне аб земскай рэформе было паднята толькі Беластоцка-Сакольскім павятовым камітэтам. Сход членаў камітэта адзінагалосна выказаўся за неабходнасць і неадкладнасць увядзення земскіх устаноў, але «па пытанні аб арганізацыі такіх галасы членаў Камітэта падзяліліся, і большасць членаў пагадзілася з меркаваннем, выкладзеным у запісцы А. А. Аненкава аб арганізацыі губернскіх і павятовых гаспадарчых органаў не на выбарчым пачатку, а па прызначэнні» [10, с. 295]. Прычынай сталі выключныя ўмовы краю — нацыянальныя і верніцкія адрозненні [10, с. 333].

У запісцы І. Гліндзіча, прадстаўленай Гродзенскаму губернскаму камітэту, але пакінутай без разгляду, была выказана думка, што да ўдзелу ў кіраванні земскімі справамі павінны быць дапушчаны ўсе мясцовыя землеўладальнікі, без уліку іх паходжання [10, с. 198].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў смуце 1863 г., ужо вымерла, а новае пакаленне спакойнай легальнай працай на ўсіх адкрытых дзеля яго напрамках даказала сваю праваздольнасць.

У запісцы члена Гродзенскага губернскага камітэта кн. Святаполк-Чацвярцінскага сцвярджаецца, што вынікам абмежавальных пастаноў стала абясцэньванне маёнткаў, адсутнасць крэдыту, застой прамысловасці. Павятовыя камітэты Бабруйскі (Мінскай губерні), Лепельскі (Віцебскай губерні) прызналі пажаданым наданне сялянам польскага паходжання права на атрыманне пазыкі з дваранскага зямельнага банка.

Значна радзей у камітэтах ставілася яўрэйскае пытанне. Супраць скасавання абмежаванняў, усталяваных адносна набыцця яўрэямі зямлі, падалі голас Себяжскі (Віцебскай губерні) і Рэчыцкі (Мінскай губерні) павятовыя камітэты. Апошні настойваў на прыняцці сапраўдных захадаў супраць арэндавання яўрэямі маёнткаў і ўвогуле супраць заключэння імі (супраць закону) іншых здзелак адносна сельскай пазямельнай уласнасці.

Падводзячы агульны вынік працы, выкладзеныя пажаданні можна звесці да двух асноўных палажэнняў, якія падзяляла большасць камітэтаў: 1) садзейнічаць пераходу сельскіх таварыстваў да падворнага і хутарскога ўладанняў, надаць асобным сялянам права выдзяляць свой надзел з абшчыннага землекарыстання, нягледзячы на нязгоду міру; 2) скасаваць адасобленасць сялян у правах грамадзянскіх і асабістых па стане, у прыватнасці — у парадку кіравання і суда.

Праграма пытанняў, прапанаваных мясцовым камітэтам, не тычылася залежнасці сельскагаспадарчага промыслу ад умоў сялянскага землекарыстання і правапарадку. Тым не менш камітэты паўсюдна вызначылі першаснае значэнне сялянскай гаспадаркі ў эканоміцы дзяржавы. Камітэты звярнулі ўвагу на цяжкія прававыя ўмовы сялянскай гаспадаркі і прыйшлі да высновы, што без карэнных змен у галіне сельскай гаспадаркі немагчыма праяўленне гаспадарчай ініцыятывы, прадпрымальнасці і якаснага паляпшэння землегаспадарчай культуры [11, с. 15].

Такім чынам, хоць Асобая нарада, якую узначальваў С. Ю. Вітэ (як і ўсе папярэднія), не дала рэальных вынікаў у вырашэнні аграрнага пытання напярэдадні Першай расійскай рэвалюцыі, яе значэнне ў актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця было істотным. Праз нараду да пошукаў вырашэння аграрнага пытання прыцягваліся не толькі ўрадавыя колы, але і прадстаўнікі розных неўрадавых структур, а таксама спецыялісты — аграрнікі, эканамісты, грамадскія дзеячы і інш. Шырокае абмеркаванне аграрнага пытання ў цэнтры і на месцах садзейнічала актывізацыі дзейнасці ў гэтым напрамку палітычных партый і рухаў, што ўзнікаюць у канцы XIX— пачатку XX ст.

Абмеркаванне аграрнага пытання ў губернях Паўночна-Заходняга краю ў канцы XIX — пачатку XX ст. як пад эгідай Міністэрства фінансаў, так і Міністэрства ўнутранных спраў стала вынікам рэзкага абвастрэння сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне, звязанага з адсталасцю сельскай гаспадаркі, кансервацыяй у ёй на працягу другой паловы XIX ст. перажыткаў феадалізму. Пры гэтым погляды ўдзельнікаў нарады на шляхі вырашэння аграрнага пытання падзяляліся паміж прыхільнікамі прымянення пераважна адміністрацыйных (праекты МУС) альбо эканамічных (Праекты Міністэрства фінансаў) метадаў. Аб прымяненні сілавых метадаў ніякай гаворкі не вялося, паколькі абсалютная большасць сялянства Беларусі таксама прытрымлівалася мірнага шляху вырашэння аграрнага пытання як у іх асабістых інтарэсах, так і ў інтарэсах усяго грамадства. У цэлым пошукі выхаду з аграрнага крызісу вяліся ў рамках патрабаванняў капіталістычнай рыначнай эканомікі. Гэта азначае, што Асобая нарада і яе камітэты на месцах прытрымліваліся ў асноўным прагрэсіўных поглядаў адносна шляхоў развіцця сялянскай гаспадаркі на рубяжы XIX—XX стст.

Адсутнасць волі да вырашэння аграрных праблем ва ўрадавых колах, разыходжанні ў поглядах на яго шляхі і абвастрэнне ўнутрыпалітычнай сітуацыі сталі прычынай таго, што распрацаваныя нарадай праекты своечасова не былі рэалізаваны. Менавіта таму і аграрнае пытанне ў грамадска-палітычным жыцці ў Беларусі, як і ўвогуле ў краіне, на рубяжы стагоддзяў зазнала пэўную трансфармацыю ў бок узмацнення левaрадыкальных падыходаў у яго вырашэнні. Гэта наглядна праявілася ў аграрных праграмах палітычных партый, у якіх па большасці рашэнне аграрнага пытання перавoдзілася з эканамічнай у палітычную плоскасць.

*Літаратура*


1. *Ленин В. И.* Полное собрание сочинений. Т. 17.
2. *Пайпс Р.* Русская революция. В 2 т. / пер. с англ. Н. И. Кигай. М.; 1994. Т. 1.
3. *Ольденбург С. С.* Царствование Императора Николая II. М., 1992.
4. НГАБ, ф. 295, воп. 1, спр. 7173.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. *Витте С. Ю.* Записка по крестьянскому делу. СПб., 1904.
6. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности / Минская губерния. СПб., 1903. Вып. 58.
7. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности / Могилевская губерния. СПб., 1903. Вып. 58.
8. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности / Виленская губерния. СПб., 1903. Вып. 58.
9. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности / Витебская губерния. СПб., 1903. Вып. 58.
10. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности / Гродненская губерния. СПб., 1903. Вып. 58.
11. *Риттих А. А.* Крестьянский правопорядок. СПб., 1904.

Summary

*The article is devoted to the consideration of attempts of the solution of social questions by local committees of the special meeting about needs of the agricultural industr and to features of this process Vas well. The reasons caused increase of crisis processes in Russian empire in the beginning of XX th century and the offers on their prevention are shown.*

*УДК 947.6*

***І. М. Рыжанкоў***

# БЕЛАРУСКАЕ СЯЛЯНСТВА ВА ЎМОВАХ ПАДРЫХТОЎКІ ДА АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ (САКАВІК — ЛІСТАПАД 1917 г.)

Неабходнасць аграрнай рэформы, здольнай задаволіць «зямельны голад» асноўнай масы сялянства, была абумоўлена ходам сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Расійскай імперыі другой паловы XIX — пачатку XX ст. Пасля звяржэння самаўладдзя яе ажыццяўленне ўзмацнялася неабходнасцю пашырэння сацыяльнай апоры новага ладу. Кабінет міністраў на чале з Г. Я. Львовым, зыходзячы з небяспекі пагаршэння харчовай сітуацыі ў краіне і зніжэння баяздольнасці расійскай арміі, якая магла ўзнікнуць ужо падчас перадзелу зямель, абмежаваўся агульнай заявай аб вырашэнні гэтага пытання Устаноўчым сходам [11]. Важным крокам Часовага ўрада ў сферы аграрнай палітыкі стала яго пастанова ад 17 сакавіка аб перадачы ў распараджэнне міністэрства земляробства на чале з А. І. Шынгаровым кабінецкіх зямель. Адначасова ўрад запэўніваў сялянства ў ажыццяўленні зямельнай рэформы пасля склікання Устаноўчага сходу і да таго часу заклікаў устрымацца ад гвалтоўных захопаў.

У гэты час на Магілёўшчыне пражывала 1 480 261 сялян, з якіх 7,8 % не мелі зямлі, 69 % належала 2 510 317 дзес. [30, с. 14—15], прыватным уласнікам — 944 384 дзес. (26 %), іншым катэгорыям насельніцтва — 162 793 (4,5 %) дзес. зямлі [30, с. 16—17]. На Віцебшчыне налічвалася 667 971 сялян [30, с. 42—43], якім належала 1 246 125 дзес. (54 %), 3,8 % з'яўляліся беззямельнымі [30, с. 14—15, 54—55], прыватныя ўласнікі валодалі 849 016 дзес. (37 %) і іншым гаспадаркам належала 174 670 дзес. зямлі або 7,6 % [30, с. 48—49]. На Міншчыне, наадварот, прыватным уласнікам (памешчыкам і хутаранам) належала большасць зямлі — 5 257 000 (67,7 %), а сялянам-абшчыннікам — 1 964 000 (25 %) дзес. і 1 900 двароў з'яўляліся беззямельнымі або малазямельнымі (да 3 дзес.) [28]. Паводле перапісу за 1916 г., тут пражывала 1 998 600 вяскоўцаў [29, с. 20]. Такім чынам, на пачатку 1917 г. з улікам не занятых немцамі паветаў Віленскай губерні ў Беларусі пераважала сельскае насельніцтва.

Першыя праявы аграрнага руху выявіліся ўжо ў сакавіку [19, с. 55] у выглядзе лясных парубак, як, да прыкладу, у маёнтку Тадуліна Мінскага павета. [26]. Як паведамляў Віцебскі губернскі камісар у Петраград, «у сакавіку ўжо адбываюцца выпадкі захопу сялянамі панскіх зямель, лясоў і арышты памешчыкаў» [19, с. 74]. Але ў выніку намаганняў мясцовых камісараў і міліцыі беспарадкі былі перапынены. Падчас першых масавых акцый, скіраваных на пераканання сялян у неабходнасці падпарадкавацца новым уладам, увага вяскоўцаў на зямельным пытанні не завастралася, і, можна меркаваць, таму, што іх арганізатары не валодалі патрэбнай на гэты конт інфармацыяй. Таму ў большасці выпадкаў зямельная тэма хоць і гучала, але ў кантэксце больш важных праблем — неабходнасці прызнання новых улад і выканання ранейшых абавязкаў. У пачатку красавіка на Круглянскім валасным сходзе прадстаўнікоў ад сялянскай грамады адзначалася, што «свабода Расіі непарыўна звязана з перамогай над немцам. [Таму] збярэм і дашлем грошы і хлеб арміі» [2, с. 71]. А сяляне Сера-каратнянскай воласці Аршан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ